Такім чынам, як і ў іншых еўрапейскіх краінах, у ВКЛ склаўся разам з дзяржаўным гербам "*Пагоня*" комплекс гербаў літоўскіх, беларускіх і ўкраінскіх зямель, якія сімвалізавалі магутнасць і адзінства дзяржавы, сведчылі аб пэўных гістарычных этапах складвання яе тэрыторыі, характэрызавалі некаторыя найбольш важныя сацыяльна-палітычныя і культурныя працэсы, што ў ёй адбываліся, нагадвалі аб тэрытарыяльных стратах, адлюстроўвалі палітычныя праграмы і дзяржаўную ідэалогію вялікіх князёў літоўскіх і тагачаснага грамадства.

Літаратура і крыніцы:


1. Gumowski M. Pieczęcie książąt Litewskich.// Atheneum Wileńskie.– Wilno, 1930.– R.VII.– zeszyt 3–4.– S.684–725.
2. Gumowski M. Pieczęcie królów polskich.– Kraków,1919.
3. Kuczyński S.K. Polskie herby ziemskie. Geneza, treści, funkcje.– Warszawa, 1993.
4. Цітоў А. Пячаткі старажытнай Беларусі. Нарысы сфрагістыкі.– Мн.: Полымя, 1993.
5. Шаланда А. Генезіс "*Пагоні*" – дзяржаўнага гербу Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.// Białoruskie zeszyty historyczne.– Bialystok, 2001.– Nr 16.– S.152–158.
6. Шаланда А. Зямельныя гербы Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў XIV–XVIII ст.// Герольд Litherland.– Горадня.– 2001.– № 2.– С.52–66.
7. Heymowski A. Herby polskie w Sztokholmskim Codex Bergshammer.// Studia źródłoznawcze.– Warszawa, Poznań, 1967.– T.12.– S.73–111.
8. Heymowski A. Herby polskie w Brukselskim Armorial Gymnich, recte Lyncenich.// Studia źródłoznawcze.– Warszawa, Poznań, 1985.– T.29.– S.95–124.
9. Цітоў А. Наш сімвал – Пагоня: шлях праз стагоддзі.– Мн.: Полымя, 1992.
10. Румянцева В.В. Эмблемы земель и гербы городов Левобережной Украины периода феодализма.– Киев, 1986.
11. Stemmata Polonica. Rękopis nr 1114 Klejnotów Długosza w Bibliotece Arsenału w Paryżu./ Wyd. H.Polaczkówna.// Prace Sekcji Historii Sztuki i Kultury Tow. Naukowego we Lwowie.– Lwów, 1929.– T.I.– S.235–240.
12. Piech Z. Monety, pieczęcie i herby w systemie symboli władzy Jagiellonów.– Warszawa, 2003.
13. Шаланда А. Да пытання аб так званых памылках на вялікіх пячатках ВКЛ Стэфана Баторыя (1576–1586 г.).// Стэфан Баторый у гістарычнай памяці народаў Усходняй Еўропы: Мат-лы міжнар. круглага стала, Гродна, 26 верасня 2003 г./ Пад рэд. Д.Карава.– Гродна: ГЦДУЕ, 2004.– С.59–66.



УДК 72.033 (476)


## ГАТЫЧНЫЯ ЦЭРКВЫ-КРЭПАСЦІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (КАНЕЦ XV – ПАЧАТАК XVII СТ.).


**Нарбутовіч А.А., Рыбак Н.А.**

УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт"
г. Гродна, РБ


У XII ст. на поўначы Францыі ўзнік новы стыль – готыка, які прыйшоў на змену раманскаму. Назва стылю паходзіць ад назвы германскага племя готаў. Паступова гэты мастацкі стыль пачаў распаўсюджвацца у краінах Заходняй, Цэнтральнай і часткова Ўсходняй Еўропы. Готычны стыль найбольш ярка ўвасобіўся ў архітэктуры (саборы




РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

ў Ам'ене, Рэймсе, Парыжы, Кёльне, Шартры, Страсбургу і інш.). Найбольш тыповыя пабудовы вылучаліся вялікай вышынёй, стромкім сілуэтам, вертыкальнымі лініямі, высокімі вежамі. Для гатычных збудаванняў характэрны востраканцовыя завяршэнні праёмаў, стрэльчатыя вокны з каляровымі вітражамі, дэкаратыўная скульптура. Галоўныя фасады сабораў упрыгожваліся карункамі разнога дэкору, ажурнымі вежамі, у цэнтры часта мелі вялікае круглае вакно (ружу) [1, с.518]. Гатычнае мастацтва ахапіла і беларускія землі. Гэта быў якасна новы этап у развіцці беларускага дойлідства. Ён пачаўся ў XIII–XIV ст. і быў звязаны з узнікненнем Вялікага княства Літоўскага і праіснаваў амаль да сярэдзіны XVI ст.

Паняцце "беларуская готыка" упершыню было ўведзена ў навуковы зварот М.Шчакаціхіным. Беларуская готыка – гэта вынік зліцця ў адзінае мастацкае цэлае планавай сістэмы візантыйска-рускага крыжова-купальнага храма з формамі і канструкцыямі еўрапейскай готыкі [2, с.39]. Сваеасаблівыя рысы беларускай готыкі заключаліся не толькі ў яе надзвычай доўгім часе панавання, але і ў функцыянальным спалучэнні культавага і абарончага дойлідства, традыцыйным выкарыстанні цаглянай муроўкі з разнастайнымі абтынкаванымі і пабеленымі плоскімі нішамі, масіўнасцю канструкцый і манументальнасцю пабудоў.

У культавай архітэктуры канца XV–1-ай паловы XVI ст. з'яўляецца новы тып пабудоў – інкастэляваныя храмы, прыстасаваныя да абароны. (Кастэль – замак пабудаваны ў цяжкадаступным месцы. На Беларусі кастэлі пачалі будавацца ў XIII–1-ай палове XIV ст. для абароны ад крыжакоў. Беларускія кастэлі адрозніваліся ад крыжацкіх большымі памерамі, узводзіліся сярод балот на невялікіх пясчаных выступах, часта штучных). У канцы XV–пачатку XVI ст. на Беларусі ўзнікае арыгінальны тып абарончага храма, фланкіраванага чатырма вуглавымі вежамі. Яго з'яўленне звязана з тым, што беларуская зямля часта была ў гэты час арэнай ваенных дзеянняў [3, с.157]. Адным з першых абарончых храмаў на Беларусі быў Сафійскі сабор у Полацку, перабудаваны ў 1494–1505 г. у храм-крэпасць. У наступныя стагоддзі полацкая Сафія неаднаразова пераробілася і ўрэшце, страціла свой абарончы характар.

Усім храмам абарончага тыпу былі ўласцівы кампактнасць аб'ёму, абарончыя вежы з байніцамі, высокі дах і выразны падзел унутранай прасторы на фартыфікацыйную і культавую часткі. У час небяспекі абаронцы храма хаваліся на гарышчы пад высокімі клінападобнымі дахамі. У скляпеністых сутарэннях (памяшканнях пад першым паверхам) размяшчаліся сховішчы правіянту. Асноўнае памяшканне культавага прызначэння (кафалікон падзяляецца 4 слупамі невялікага сячэння на роўныя па вышыні прасторавыя ячэйкі – травеі, перакрытыя гатычнымі нервюрнымі скляпеннямі розных тыпаў (зорчатымі, крыжовымі,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

сотавымі). Пры агульным падабенстве гэтых помнікаў (Супрасльская царква-крэпасць, Сынковіцкая царква-крэпасць, Мураванкаўская царква-крэпасць) у іх ёсць пэўныя адрозненні, якія адлюстроўваюць паступовую эвалюцыю форм канструкцый. На Беларусі захаваліся 2 абарончыя храмы: Сынковіцкая царква-крэпасць і Мураванкаўская (Маламажэйкаўская) царква.

Сынковіцкая царква-крэпасць у вёсцы Сынковічы (Зэльвенскі р-н) – помнік дойлідства канца XV–пачатку XVI ст. Храм у плане з'яўляецца перакошаным прамавугольнікам з чатырма баявымі вежамі па вуглах. Сцены з цэглы. Царква пакрыта высокім двухсхільным дахам з вострымі тарцовымі шчытамі. Шчыт на галоўным фасадзе аздоблены рознымі па форме плоскімі атынкаванымі нішамі. Храм быў добра прыстасаваны да абароны. Яго вежы мелі байніцы рознай формы, а таксама вінтавыя сходы, якія вялі да баявой галерэі, размешчанай на завяршэнні сцен. Царква мае значную мастацкую і гістарычную каштоўнасць і ахоўваецца дзяржавай [3, с.159].

Не меньш цікавым збудаваннем абарончага тыпу з'яўляецца Мураванкаўская царква-крэпасць (Шчучынскі р-н) – у навуковай літаратуры яе называюць Маламажэйкаўскай. Пабудавана ў першай палове XVI ст. прыблізна паміж 1516–1542 г. Да нашага часу царква не захавалася ў першапачатковым выглядзе, бо яе не раз разбуралі і перабудоўвалі. Моцна пашкоджаная ў час вайны паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй (1654–1666 г.) і Паўночнай вайны (1700–1721 г.), у XIX ст. яна двойчы рамантавалася. Мураванкаўская царква ўяўляе сабой амаль квадратную ў плане пабудову з чатырма цыліндрычнымі вежамі па вуглах. У адрозненне ад Сынкавіцкай царквы, яе вежы як бы ўцягнуты ў вуглы, што надае кампактнасць пабудове. Мае толькі адну значную абсіду (абсіда – самастойная частка пабудовы, выступ рознай формы, які замыкае прастору нефа або трансэпта. Роля абсіды – размяшчэнне ў ёй алтара). Адзначаная эвалюцыя адлюстроўвае тэндэнцыю да аднаабсіднасці, абумоўленую заходнееўрапейскімі ўплывамі. Храм мае шмат байніц, прыстасаваных для ручной агнястрэльнай зброі. Але трэба адзначыць, што інкастэляваныя храмы не маглі супрацьстаяць значнаму войску. Гэтая царква з'яўлялася не толькі абарончым збудаваннем, але і выдатна аздобленным храмам. У аснове дэкору яе фасадаў было пакладзена чаргаванне ніш розных абрысаў і велічыні. Пабеленыя нішы выразна кантраставалі з чырвоным фонам цаглянай муроўкі [2, с.38–39; 3, с.160–162].

Да таго ж архітэктурнага тыпу адносіцца царква праваслаўнага Благавешчанскага манастыра ў Супраслі. Супрасльская царква-крэпасць, пабудаваная ў якасці абарончага храма, з'яўляецца найбольш складаным і арыгінальным узорам царкоўнай готыкі ВКЛ. Храм быў створаны ў 1505–1511 г. на сродкі маршалка ВКЛ Аляксандра Хадкевіча. Храм меў пятую

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

вежу, якая была размешчана ў цэнтры асноўнага аб'ёму і дамінавала над астатнімі чатырма. У інтэр'еры значную ролю адыгрываюць фрэскі, выкананыя ў сярэдзіне XVI ст. групай жывапісцаў пад кіраўніцтвам сербскага майстра Нектарыя. У XVI ст. царква ўваходзіць у комплекс манастыра, дзе складаліся летапісы, свецкія і рэлігійныя творы. У 1944 г. царква была разбурана (збераглася часткова). Захаваліся рэшткі фрэсак, якія адрэстаўраваны ў 1964–1966 г. і зберагаюцца ў Беластоцкім музеі. Зараз царква аднаўляецца [3, с.160; 4, с.140].

Дэкаратыўнае вырашэнне абарончых цэркваў заснавана на кантрасце чырвонага колеру адкрытай муроўкі з выбеленымі плоскімі нішамі, якія мелі завяршэнні ў выгдядзе арак розных тыпаў. Асноўны дэкаратыўны акцэнт рабіўся на шчыце галоўнага фасада, дзе нішы разнастайных форм утваралі маляўнічую ярусную кампазіцыю.

Ярка і вобразна рысы касцёла-крэпасці прысутнічаюць у храме 1606 г. у мястэчку Камаі (Пастаўскі р-н). У стылёвай трактоўцы касцёла спалучаны прыёмы і формы абарончага дойлідства, архітэктуры готыкі і рэнесансу. Формы асноўнага аб'ёму касцёла (без правага крыла) блізкія да ідэальных: амаль квадратны неф, які пераходзіць у абсіду з невялікаю бакавою рызніцаю. Неф і абсіда маюць крыжовыя скляпенні, над якімі высіцца двухсхільны дах. Галоўны фасад фланкіруюць цыліндрычныя вежы. Іх праемы, у выглядзе амбразур і байніц, не пакідаюць сумненняў адносна абарончага паходжання іх архітэктуры [1, с.233].

Такім чынам, на прыкладзе разгледжаных абарончых храмаў відаць, як пад уплывам готыкі і рэнесансу паступова трансфармаваліся і відазмяняліся традыцыі дойлідства беларускіх зямель. У стварэнні помнікаў беларускага абарончага дойлідства XV–XVII ст. значная роля належала традыцыям мясцовага драўлянага дойлідства.

Літаратура:

1. Архітэктура Беларусі: Энцыкл. давед./ Беларус. энцыкл.; Рэдкал.: А.А.Воінаў і інш.– Мн.: БелЭн, 1993.– 620 с.
2. Габрусь Т.В. Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока.– Мн.: Ураджай, 2001.– 278 с.
3. Гісторыя беларускага мастацтва: У 6-ці т. Т.1: Ад старажытных часоў да другой паловы XVI ст./ Рэдкал.: С.В.Марцэлеў і інш.– Мн.: Навука і тэхніка, 1987.– 304 с.
4. Лакотка А.І. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры.–Мн.: Ураджай, 1999.–210с.

**Резюме**

**Готические церкви-крепости на территории Беларуси (конец XV – начало XVII вв.).**

**Нарбутович О.А., Рыбак Н.А.**

В статье рассматриваются церкви-крепости, построенные на территории Беларуси в готическом стиле в конце XV– начале XVII в.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

**Summary**
**The Gothic churches-fortresses in territory of Belarus**
**(end XV– beginning XV II centuries).**
**Narbutovich O.A., Rybak N.A.**

In clause the churches-fortresses constructed in territory of Belarus in Gothic style in the end XV– the beginning XVII centuries are considered.

УДК 27(476)

## КАТОЛИЧЕСКИЕ МОНАШЕСКИЕ ОРДЕНА И КУЛЬТУРА ЗЕМЕЛЬ ВОСТОЧНЫХ СЛАВЯН ВКЛ В XVI - XVIII ВВ.

**Корнилова Л.А.**

УК «Белорусский государственный музей истории религии»
г. Гродно, Республика Беларусь

Изменение положения религиозных организации в государстве, происшедшее в последние десятилетия, нашло отражение в интересе к изучению отечественной истории культуры и религии. Целенаправленные исследования в этой области дают возможность понимания культуротворческих процессов в условиях взаимоотношения двух христианских миров.

Географическое положение белорусских земель, изменение политической и религиозной ориентации отразились на духовных представлениях и культуре белорусов принадлежащей одновременно и Востоку и Западу. Сформированная на основе различных и в то же время дополняющих друг друга христианских традиций, культура представлена многочисленными памятниками, составляющими общенациональное богатство. Культура Беларуси создавалась людьми разных национальностей и разной конфессиональной ориентации. В XVI - XVIII вв. важным фактором формирования культуры славянских земель ВКЛ была деятельность монашеских орденов, ставших в посттридентскую эпоху ядром политического и религиозно-культурного движения контрреформации.

Специальных исследований культурно-исторической роли орденов в этот период до недавнего времени в Беларуси не было. Опубликованные в 70-е годы Я.Н.Марашем две монографии, несмотря на собранный богатый документально-архивный материал, имели сугубо атеистическо-идеологическое направленность. Изданное в к.90-х гг. XX в. исследование Т.Б.Блиновой по истории ордена иезуитов, хотя и сохраняло, но было уже более свободно от жёстких идеологических штампов.

На рубеже XX-XXI вв. опубликовано достаточно много материалов по истории искусства и культуры Беларуси, где опосредовано раскрывается и роль монашеских орденов. В области изучения архитектурного наследия - работы С.Адамович, О.Баженовой (Горшковоз), В.Глинника,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ